# РЭЦЭНЗІІ

УДК 784.4(=161.3):781.63(049.32)

***Зяневіч У.К. Аранжыроўка беларускіх народных песень :*** *вучэб.-метад. дапам. Мінск : БДУКМ, 2014. 360 с.*




Формы і метады сцэнічнай рэпрэзентацыі твораў фальклору становяцца сёння ўсё больш важнай і актуальнай тэмай музычнай педагогікі і канцэртнай практыкі. Творчае засваенне народных мастацкіх традыцый у працэсе навучання і выхавання студэнтаў – адна з дзейсных форм захавання народнай культуры. У той жа час фарміраванне асобы музыканта-інтэрпрэтатара народнай музыкі, развіццё яго мастацкага таленту немагчыма без працэсу спасціжэння спецыфікі і своеасаблівасці народнай духоўнай культуры.

Нягледзячы на запатрабаванасць народнай музыкі айчыннай мастацкай практыкай, твораў, якія адпавядалі б эстэтычным густам сучаснага грамадства ў гэтай галіне, недастаткова. Спробы мастацкага ўвасаблення народнай песні маюць невысокі мастацкі ўзровень, дэманструюць неразуменне характару, стылю, жанравых асаблівасцей і спецыфікі народнай песні ў цэлым. Аранжыроўка як форма інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі народнай песні набывае ў гэтых умовах важнае значэнне.

Падручнікаў, якія былі б прысвечаны цэласнаму, сістэмнаму разгляду творчых метадаў у працы над народнапесенным матэрыялам, на жаль, няма. Цяжкасці ў падрыхтоўцы такога падручніка звязаны са шматаспектнасцю праблемы. Аўтар, які бярэцца за яе аналіз, павінен мець рознабаковую падрыхтоўку – яму трэба быць і фалькларыстам, і культуролагам, і му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зыкам, які добра ведае жывую народную мову і разбіраецца ў прыродзе і спецыфіцы народна-бытавога і прафесійнага выканальніцтва.

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Аранжыроўка беларускіх народных песень», які выдаў у 2014 г. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, у пэўнай ступені выпраўляе гэту сітуацыю. Яго аўтар, прафесар кафедры беларускай народнапесеннай творчасці БДУКМ У. К. Зяневіч, валодае ўсімі азначанымі вышэй якасцямі. Яго аранжыроўкі беларускіх народных песень увайшлі ў мастацкі ўжытак і творчую практыку многіх калектываў, арыентаваных на інтэрпрэтацыю і папулярызацыю беларускай народнай песні не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

У сваёй працы У. К. Зяневіч ставіць мэтай на прыкладзе ўласных аўтарскіх апрацовак беларускіх народных песень вызначыць творчыя метады ў інтэрпрэтацыі народнай музычнай традыцыі, раскрыць асноўныя механізмы, прынцыпы і прыёмы аранжыроўкі для народнага хору і народнага вакальнага ансамбля, прапанаваць студэнтам апрабаваныя на практыцы методыкі працы з фальклорным матэрыялам. Дапаможнік з'яўляецца важным інструментам выхавання выканаўцы народнай песні, фарміравання яго музычнага густу і мастацкага мыслення. Ён дае ўважліваму студэнту магчымасць прасачыць увесь ланцужок шматаспектнай творчай дзейнасці хормайстра: ад збірання ўнікальных узораў песеннага фальклору і іх наступнай расшыфроўкі і аранжыроўкі да непасрэднага ўвасаблення твора на сучаснай сцэне.

Найважнейшая задача, якую вырашае аўтар працы, – пошук арганічнага стылістычнага адзінства аўтэнтычнай пеўчай і канцэртна-сцэнічнай выканальніцкіх форм. Мастацкая інтэрпрэтацыя народных песень, зробленая аўтарам, заснавана на разуменні прыроды беларускага меласу, вялікай павазе да захавальнікаў традыцыйнай беларускай культуры.

Структура і логіка выкладу матэрыялу ў дапаможніку зразумелыя. Дапаможнік складаецца з прадмовы «Ад укладальніка», трох раздзелаў, метадычных парад, бібліяграфічнага даведніка і спіса літаратуры.

У прадмове абгрунтоўваецца актуальнасць выдання, тлумачыцца структура і змест, фармулююцца задачы, даюцца агульныя метадычныя парады. Тры раздзелы, якія састаўляюць асноўны змест дапаможніка, змяшчаюць аўтарскія апрацоўкі беларускіх народных песень для жаночага хору і вакальных фальклорных груп жаночага складу (I раздзел), мужчынскіх фальклорных ансамбляў (II раздзел), народнага хору і фальклорных ансамбляў змешанага тыпу (III раздзел).

Апрацоўкі беларускіх народных песень, якія прадстаўлены ў дапаможніку, ахопліваюць два гісторыка-стылявых пласты нацыянальнага песеннага фальклору:

– раннетрадыцыйны фальклор (каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя песні);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пазаабрадавая лірыка, у тым ліку мужчынская выканальніцкая традыцыя; акрамя таго, падаюцца апрацоўкі ўзораў кантавай культуры Беларусі.

Харавыя партытуры ў дапаможніку прадстаўлены рознымі па колькасці нотных радкоў сістэмамі, што робіць хрэстаматыю карыснай у класе чытання харавых партытур.

Творы, якія змешчаны ў асноўных раздзелах, напісаны для народных выканальніцкіх калектываў рознага складу, што дазваляе выкарыстоўваць дапаможнік у якасці рэпертуарнага зборніка.

Інфармацыйна-метадычная частка арганізавана ў форме лаканічных аналітычных каментарыяў-эцюдаў са спасылкамі на крыніцы арыгінальнага фальклорнага матэрыялу, пакладзенага ў аснову аранжыровак, што дае магчымасць параўнальнага аналізу.

Праца У. К. Зяневіча мае вялікую каштоўнасць для музычна-адукацыйнага працэсу. Гэты творчы вопыт, безумоўна, можа быць запатрабаваны ў навучальных установах пры падрыхтоўцы выканаўцаў народных песень. Засваенне навыкаў аранжыроўкі дапаможа будучым інтэрпрэтатарам у стварэнні арыгінальных версій твораў песеннага фальклору, будзе садзейнічаць павышэнню іх кваліфікацыі. У той жа час актуальнасць працы не абмяжоўваецца дыдактычнымі якасцямі. Яе вынікі актуальныя і для мастацка-выканальніцкай практыкі і з поспехам могуць быць выкарыстаны ў творчасці мастацкіх калектываў Беларусі, узбагацяць рэпертуар сучасных хароў і ансамбляў народнай песні.

Кніга займе дастойнае месца ў бібліятэцы сучаснай вучэбна-метадычнай літаратуры.

**М. П. Дрынеўскі,**
мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, народны артыст БССР, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ